**11 красавіка — Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў**

***У гэты дзень у 1945 годзе ва ўмовах разгрому нямецка-фашысцкіх войск у другой сусветнай вайне вязні Бухенвальда на чале з інтэрнацыянальным палітычным цэнтрам паднялі паўстанне, у выніку якога канцэнтрацыйны лагер быў ліквідаваны. 19 красавіка на жалобным мітынгу былыя зняволеныя далі клятву аб бязлітаснай барацьбе з фашызмам.***
***У гэтым месяцы ў 1945 годзе таксама былі вызвалены вязні Заксенхаўзэна (22 красавіка), Дахаў (29 красавіка), Равенсбрука (30 красавіка).***



# АКУПАЦЫЯ

## (10.07.1941-10.07.1944)

**(Працяг. Пачатак у №№ 67-68, 76-77, 120, 123-124, 126, 130-131, 134, 137-138, 140, 143-144 за 2001 г., 37-38, 41-42 за 2002 г.).**

У годзе 1942-ім на некаторых надмагільных помніках паявіліся невялікія круглыя вянкі са штучных кветак і яловых галінак, прысланыя з Германіі і Аўстрыі роднымі салдат, загінуўшых у першую сусветную вайну. Аднойчы сям'я з Германіі нават прыехала наведаць старую магілу. На новыя прыязджалі родныя некалькіх загінуўшых салдат, прывозілі з Германіі кветкі ў вазончыках і невялікія вянкі. З лета 1941 года па вясну 1944 было захавана каля 80-90 салдат вермахта і мадзьяраў (так называлі сябе самі салдаты венгерскай арміі). Яны ўдзельнічалі ў карных акцыях, неслі вартавую службу. Для пахавання сваіх саюзнікаў немцы выдзелілі асобна невялікі ўчастак могілак з права́ га боку ад уваходу, аддзелены ад ных. Адразу адпускалі дзяцей тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі. У другіх жа не было ні знаёмых, ні золата. Непадалёку ад ачаплення стаяла легкавая машына бургамістра. Сам Якубік са світай быў у будынку школы. Шафёрам на гэтай машыне працаваў Аляксандр Крамскі, былы чыгуначны кандуктар станцыі Лунінец на пасажырскіх цягніках, які ў пачатку 1940 года пераехаў з СССР у Заходнюю Беларусь. Ажаніўся на лунінчанцы, застаўся на акупіраванай тэрыторыі. Узнікае пытанне: як былому ўсходніку даверылі руль машыны бургамістра? А справа ў тым, што яго жонка яшчэ да 1939 года прыслужвала ў сям'і Якубікаў, а ў гады акупацыі была там жа паварыхай. А Крамскога многія жыхары горада ведалі як годнага чалавека. Да яго і падышлі двое бацькоў, якія ў савецкі час працавалі на чыгунцы і ведалі яго з тых даваенных часоў, з просьбай неяк дапамагчы іх дочяго варыць. Хадзілі на бойню, выбіралі нейкія адходы тлушчу, у ямінах – рэшткі костак, здабывалі недзе соду, нешта дабаўлялі і варылі мыла. У час гэтага працэсу ў дварах стаяў вельмі непрыемны пах. Двойчы варылася «акупацыйнае мыла» і ў нашым двары. Атрымалася, як і ў большасці лунінчан, не вельмі ўдалае.

А на гарадской бойні часовыя гаспадары ўстроілі вяндлярню. Тушы валоў, свіней, вэнджаніну і іншую прадукцыю – шкуры, рогі, капыты – усё адпраўлялася ў Германію, але нешта перападала і мясцовай знаці. На работу на бойню накіроўваліся людзі па вялікім знаёмстве, таму што адтуль можна было прынесці нешта і дадому.

Усе гады акупацыі бесперабойна працавала ў горадзе нямецкая службовая пошта. Вельмі многа пасылак з нарабаваным адпраўлялася ў Германію. І афіцэры, і чыноўнікі былі сапраўднымі бандытамі-рабаўнікамі, але

вага боку ад уваходу, аддзелены ад нямецкага боку дарожкай. Тут было захавана 12-15 загінуўшых мадзьяраў.

Усе нямецкія пахаванні былі размешчаны роўнымі радамі, «тварам» на Шырокапясковую. Крыжы былі ва ўсіх аднолькавыя, белага колеру, на кожным была замацавана шыльда, таксама белага колеру, у форме таго ж нямецкага ваеннага крыжа з чорнай акантоўкай. На шыльдзе гатычным шрыфтам чорнага колеру былі напісаны ўсе дадзеныя пра загінуўшага. Здаецца, на могілках хавалі толькі салдат і сержантаў. Прах афіцэраў з тылавога Лунінца везлі ў фатэрлянд. Крыжы на магілах мадзьяраў былі іншымі і іншымі былі шыльды з надпісамі на нечытаемай і незразумелай венгерскай мове.

Пасля вызвалення Лунінца ад фашысцкіх захопнікаў нямецкія воінскія могілкі былі разбураны. Асабліва частка з пахаваннямі 1941-1944 гадоў. Брацкія магілы першай сусветнай вайны яшчэ некаторы час былі ў добрым стане. Але паступова час і людзі разбурылі іх. Усе крыжы з нямецкіх магіл былі вырваны, зламаны і спалены. Паступова зраўняліся з зямлёй узгоркі магіл. Тут пасвілі жывёлу жыхары навакольных дамоў, хлопчыкі гулялі ў футбол. На месцы могілак утварылася пустка ***(на здымку)***.

Акупанты з усіх бакоў душылі людзей, прымушалі працаваць на сябе. І, каб мець танную рабочую сілу, забіралі маладых, а потым і цэлыя сем'і ў Германію.

Аднойчы ў недабудаваную школу на Чырвонай вуліцы сагналі моладзь для адпраўкі ў Нямеччыну. У большасці сваёй гэта былі юнакі і дзяўчаты з навакольных вёсак, але трапіла туды і гарадская моладзь, казалі – была аблава. Школу ачапілі паліцаі, жандармы. Бацькі гараджан тут жа прыйшлі выручаць сваіх дзяцей. Некаторым гэта ўдалося – за самагон, золата паліцаі ды і жандармы адпускалі затрыма- з просьбай неяк дапамагчы іх дочкам. І ён тут жа згадзіўся. Завёў машыну, заехаў за ачапленне ў двор школы, пасадзіў дзяўчын у машыну і вывез назад праз ачапленне на Млыновую вуліцу, дзе іх чакалі бацькі. Праз Фабрычную, чыгуначныя пуці яны дабраліся да Баханова, там быў іх дом.

Пасля вызвалення Лунінца А. Крамскі быў прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў у кавалерыі. Сям'я выехала ў Пінск. Баяліся рэпрэсій. У 1946 годзе завербаваліся ў Калінінградскую вобласць. Крамскі працаваў шафёрам у райкаме партыі ў г. Неман.

Вясной 1942 года ў Лунінцы была паводка. Пасля снежнай зімы 1941-42 гг. надышла ранняя вясна з хуткім растайваннем снегу, ускрыліся і разліліся рэкі. Воды Прыпяці дайшлі да навакольля горада ў раёне Легава, затапіла агароды і некалькі дамоў і гаспадарчых пабудоў. Вада плёскалася па абодва бакі чыгуначнага палатна Лунінец-Сарны, у раёне Віра размыла пераезд. Акупанты кінулі на ўмацаванне насыпу гараджан і ваеннапалонных. Калі пагроза размыву плаціны мінавала, немцы ўстрайвалі прагулкі, іншы раз са сваімі дамамі, па чыгуначным палатне, любаваліся разлівам вады (гэткім Лунінецкім морам) з плаваючымі па ёй снежналедзянымі выспамі, разбуранымі стагамі сена. Хадзілі сюды і гараджане, і, у першую чаргу, мясцовыя хлапчукі.

Летам 1942 года ў горадзе працавала 3 ці 4 цырульні. У дзвюх рабілі манікюр не толькі жанчыны, але і мужчынскі – для афіцэраў.

Ужо ў 1942 г. у Лунінцы не было гаспадарчага мыла, так неабходнага для мыцця бялізны. Савецкія запасы ў гараджан скончыліся, купіць не было дзе. Туалетнае з камісіёнак каштавала дорага ды і не падыходзіла для гэтых мэт. Людзі сталі ўжываць для мыцця попельную ваду. Попел з пліт і печаў залівалі гарачай вадой, адстойвалі, працэджвалі – і «штучнае» мыла гатова. Многія пачалі бандытамі-рабаўнікамі, але афіцыйна ўзаконенымі, з ордэнамі і медалямі, ваеннымі званнямі, часта – з вышэйшай адукацыяй.

Вясной 1943 года ў Лунінец з Германіі вярнулася Стэфа Райская (вядомая ў раёне вуліцы Чырвоная хатняя прачка. Яе бацька – лунінецкі чыгуначнік-пенсіянер у час міжуладдзя ў 1941 годзе ўзначальваў так званую «народную» ці гарадскую паліцыю парадку. Памёр у час акупацыі). Яна выехала ў «трэці рэйх» добраахвотна і па зразумелых прычынах: брат-алкаголік з буйным норавам пастаянна збіваў сястру, вось і вырашыла яны пакінуць Лунінец. Але і ў Германіі шчасця не знайшла. Трапіла на працу да баўэра, які яе збіваў, гвалтаваў, а калі дзяўчына зацяжарыла, выгнаў. Вярнулася ў Лунінец з памутнелым розумам. Брат зноў збіваў яе і здзекваўся. Нарадзіла мёртвае дзіця, што канчаткова пазбавіла яе розуму. Хадзіла па горадзе, расказвала пра здзекі баўэра, пра дрэннае жыццё ў Германіі. Такая агітацыя, прытым – наглядная, не падабалася ні гестапаўцам, ні паліцаям. І аднойчы Стэфка знікла. Хутка памёр і яе брат ад перапою.

У гады акупацыі ў мяне было многа вулічных сяброў. Усе знаёмыя суседзі хлопчыкі-яўрэі – Хаім Трыбух, Мойша Трыбух, Борух Гульман, Беня Капланскі і іншыя – былі ўжо расстраляны акупантамі. Брат і сястра з вуліцы 17 Верасня загінулі ад асколкаў савецкіх авіябомбаў, – на пажарышчы я бачыў іх паўабгарэўшыя целы. Аркадзь Вайцюк – сын паліцая – разам з бацькамі пайшоў з немцамі. Сын адваката Булгакава з Брадзілаўкі Толік Вашчула таксама пакінуў Лунінец у 1944 годзе. Усе сябры палякі і беларусы – Стасік Тарнагурскі, Цімафей Пракаповіч і іншыя – выехалі ў 1946 годзе ў Польшчу. Лёва Шыдлоўскі, вялікі дом сям'і якога і сёння стаіць на рагу вуліц Чырвоная і Сялянская, хутка выехаў на Украіну. Мы з ім больш не бачылі адзін аднаго. Пасля вайны давялося мне заводзіць новых сяброў.

**Л. КОЛАСАЎ.**

**(Працяг будзе.)**